Основной клинической формой умерших является фиброзно-кавернозный туберкулез легких – 63,4%. Смертность от туберкулеза в первый год наблюдения во фтизиатрической службе (ф. 33) составила 2,9% от числа впервые выявленных пациентов (в 2021 г. 4,5%). В 11,3% туберкулез был выявлен посмертно (в 2021 г. 23,5% умерших от туберкулеза). 11,3% (7 чел.) не были идентифицированы как жители г. Астрахани или других территорий и не состояли на учете в противотуберкулезной службе. В 2022 г. доля умерших на дому уменьшилась на 6% и составила 25,8% против 27,3% в 2021 г. Число умерших в стационарах нетуберкулезного профиля снизилось с 17,0% в 2021 г. до 14,5% в 2022 г. Показатель смертности пациентов, больных туберкулезом, от ВИЧ-инфекции составил в 2022 г. –1,9 на 100 тысяч населения (2021 г. – 1,3; 2020 г. – 1,5). Имеет место рост показателя.

В динамке отмечается снижение уровня смертности от туберкулеза, основными причинами смерти являются позднее выявление, отсутствие флюорографического обследования более 2 лет, множественная лекарственная устойчивость к противотуберкулезным препаратам. Основная группа умерших не имела приверженности к своевременному обследованию и лечению за счет социально-психологических особенностей личности и фоновых заболеваний (алкоголизм, наркомания и т. д.).

---

Чарнякевіч І.С.
Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі універсітэт, Гродна, Беларусь

# ПРАФЕСІЙНАЯ І ГРАМАДСКА-АСВЕТНІЦКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ГРОДЗЕНСКІХ ЛЕКАРАЎ МІЖВАЕННАГА ДВАЦЦАЦІГОДДЗЯ

**Актуальнасць.** Прафесія ўрача заўседы ўспрымалася ў грамадстве па-асабліваму. Ад яго звычайна патрабаваліся не толькі бездакорныя веды ў адпаведнай галіне і валоданне практыкамі лячэння, але і актыўны ўдзел у асветніцкай дзейнасці, распаўсюджанне ведаў сярод насельніцтва ў галіне прафілактыкі захворванняў.





Репозиторий ГрГМУ

**Мэта.** Ахарактарызаваць асаблівасці прафесійнай і грамадскай дзейнасці гродзенскіх лекараў міжваеннага дваццацігоддзя.

**Метады даследавання.** Гісторыка-генетычны метад; агульнанавуковыя метады аналізу і сінтэзу.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Што датычыць спецыялізацыі гродзенскіх лекараў разглядаемага перыяда, то ў літататуры ўпамінаецца восем педыятраў, дзевяць венеролагаў (часта яны сумяшчалі спецыялізацыю з дэрматалогіяй, хаця упамінаюцца два дэрматолагі без сувязі са спецыялізацыяй па венерычных захворваннях), сем гінеколагаў, сем хірургаў, чатыры ларынголагі, тры акулісты, адзін з якіх сумяшчаў спецыялізацыю з ларынгалогіяй, два эпідэміолагі, адзін рэнтгенолаг, два спецыялісты па псіхічных захворваннях, адзін з якіх быў адначасова венеролагам, а другі – спецыялістам па легачных захворваннях. У даведніку «Памяць пра Гродна» фігуруе адзін дантыст, а таксама адзін фельчар. Самая вялікая група ўрачоў – гэта лекары, акрэслівааемыя як «спецыяліст па ўнутраных захворваннях».

Акрамя сваей непасрэднай прафесійнай дзейнасці, большасць лекараў у той ці іншай ступені адзначалася актыўнай грамадска-асветніцкай дзейнасцю. Шмат хто з іх упамінаецца ў якасці публічных лектараў падчас спецыяльных мерапрыемстваў. Так, у дні правядзення Вялікай выставы па гігіене ў Гродна (канец лютага – пачак сакавіка 1939 г.) ўрачы горада выступілі з публічнымі лекцыямі на самую розную тэмытыку.

Частка ўрачоў займалася выкладчыцкай дзейнасцю. Яшчэ да Першай сусветнай вайны Канстанцін Бялецкі, які стане потым удзельнікам беларускага нацыянальнага руху, выкладаў на курсах па падрыхтоўцы сясцер міласэрднасці для таварыства Чырвонага Крыжа. Есць звесткі, што на 1926 год доктар Самуэль Бык з'яўляўся выкладчыкам першай гуманітарнай коадукацыйнай гімназіі ў Гродне. Доктар Тадэвуш Эйсмант выкладаў на курсах гігіены пры гарадской Радзе (дадзеныя на 1930 год), а доктар Рудольф Лотыш з'яўляўся выкладчыкам гігіены ў гімназіі імя А. Міцкевіча (1933).



Репозиторий ГрГМУ